2. Северикова, Н.М. П.А.Флоренский о единстве мира и человека: к выходу в свет первого полного издания книги «У водоразделов мысли (Черты конкретной метафизики)». Статья вторая/ Северикова Н.М. // Философские науки. – 2005. – №1. – С.74-92.
3. Семенюта, Н.Ф. Красота и гармония человека/ Н.Ф.Семенюта// Народная асвета. – 2005. – №6. – С.74-76.
4. Вергазова, О.Б. Золотая пропорция: от древнерусских саженей до современного дизайна/ О.Б.Вергазова // Математика в школе. – 2007. – №8. – С.59-64.
5. Дружинина, Л.И. Цикл деятельностно-ценностных задач по теме «Многогранники»/ Л.И.Дружинина// Педагогические технологии. – 2009. – №1. – С.99-132.

## РАЗЬБЯРЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ

**І.П. Хіцько**
*Віцебск, ВДУ*

На працягу стагодзяў беларускі народ, у тым ліку і на Віцебшчыне, ствараў сваю самастойную, самабытную культуру, значнай часткай якой з'яўляецца і апрацоўка драўніны. Імёны і вырабы майстроў мінулых стагоддзяў амаль поўнасцю зніклі з памяці гісторыі, гэтаму ў значнай ступені паспрыялі шматлікія войны і падатлівасць матэрыялу ад атмасферных уздзеянняў.

Найбольш вядомымі раннімі творамі першабытнага разьбарскага мастацтва Віцебшчыны з'яўляюцца знаходкі з Асавецкага паселішча Бешанковіцкага раёна 2-ой паловы 1-га тысячагоддзя н.э. і полацкіх курганаў 8-10 стагоддзяў. Сярод мноства прадметаў з розных матэрыялаў знойдзены і драўляныя разьбяныя вырабы. Усё гэта дае падставу разважаць, што старажытнаму чалавеку на тэрыторыі Прыдзвінскага краю былі вядомы семантычны дэкор, асновы разьбы, рэльефная і скульптурная пластыка.

Звычайна майстры таго часу выконвалі вырабы для сябе, на продаж, ці на заказ. Калі першыя неслі ўтылітарны характар і былі больш простыя ў сваім выкананні, то вырабы на продаж ці заказ, звязаныя з аздабленнем палацаў, храмаў, былі больш грунтоўныя. Гэта і паспрыяла нараджэнню першых рамесніцкіх аб'яднанняў па выкананню разьбяных мастацкіх вырабаў, асабліва з прыняццем хрысціянства і будаўніцтва храмаў (X-XI ст.ст.). Калі буйныя гарадскія храмы аздаблялі архітэктары, мастакі, ці цэхавыя рамеснікі, то вясковыя ў асноўным мясцовыя майстры-самавукі

Драўляныя скульптуры «Мікола Мажайскі», «Укрыжаванне», Аршанскага старца Іпаліта (XVII ст.) – доказ майстэрства і развіцця драўлянай скульптуры на Віцебшчыне. Майстры Аршанскага манастыра ў сярэдзіне XVII стагоддзя сумесна з іншымі беларускімі майстрамі прынеслі ў рускую дзяржаву высокае майстэрства ажурна-рэльефнай разьбы і драўлянай скульптуры. Найбольш выдатны твор беларускіх разьбяроў у рускай дзяржаве, уцалелы да нашых дзён, іканастас Смаленскага сабора Новадзявочага манастыра ў Маскве, выкананы ў 1683-1885 г.г. Спачатку разьбянымі работамі кіраваў Клім Міхайлаў са Шклова, а потым, з мая 1684 г., уключаючы 1685 г., брыгадай разьбяроў кіраваў Осіп Андрэеў, выхадзец з Оршы.

Нам вядомы некаторыя імёны майстроў-разьбяроў з Віцебшчыны, працаваўшых у Маскве і іншых месцах Рускай дзяржавы ў XVII ст.: Андрэеў Восіп, старцы Іпаліт і Арсеній з Оршы; Акулаў Герасім з Дуброўна; Грыгорьеў Даніла, Дракула Іван, Іваноў Якаў, Паўлаў Давыд, усе з Віцебска. Рэзчыкі і токары з Віцебска: Піліп Тарасаў, Кірыл Талкачоў, Самойла Багданаў, Даніла Какотка, Якуб Пагарэльскі. Андрэй Федараў з Воршы, і Федар Мікулаеў з Дуброўна. Май-

стры разьбяных спраў з Віцебшчыны, якія працавалі ў рускай дзяржаве ў XVII-пач. XVIII ст.ст. выконвалі работы па аздабленню храмаў і царскіх палацаў. Выраблялі разьбяныя іканастасы, клірысы, куфры, шафы, кубкі, грабяні, цацкі для царэвічаў, упрыгожвалі царскія карэты, рабілі разьбяную мэблю для палацаў, узорчатыя ваконныя рамы і мноства розных драўляных распяццяў.

Побач з ажурна-рэльефнай разьбой, атрымаўшай развіццё на тэрыторыі Віцебшчыны (і ўсей Беларусі) у другой палове XVII ст., існавала і традыцыйная рэльефная (глухая) разьба на плоскасці, станаўленне якой адбылося ў эпоху Адраджэння.

Прыкладамі мясцовай «глухой рэльефнай разьбы» з'яўляюцца царскія вароты Юр'еўскай царквы 1690 г. былога Маркава манастыра ў Віцебску. Таксама царскія вароты Троіцкай царквы Маркава манастыра ў Віцебску, якая па стылі выканання падобна на папярэднюю. Вядома, что іканастас Троіцкай царквы ў 1691 годзе выконвалі разьбяры: Я. Паддубец і І.Качар з Чарэі, І. Магілявец з Магілёва, а таксама майстры І. Галубкоў і А. Маркевіч з Віцебска.

Яркім прыкладам “глухой” разьбы традыцыйнага нізкага рэльефу з'яўляюцца драўляныя дзверы галоўнага партала касцёла кармелітаў з Глыбокага.

З XVIII ст. на тэрыторыі Віцебшчыны шырокае распаўсюджанне атрымалі разьбяныя скульптурныя распяцці, якія выкарыстоўваліся ў капліцах, на могілках, у храмах, на скрыжаваннях дарог, на ўскраінах паселішчаў. Пераважна гэтыя распяцці выконваліся мясцовымі майстрамі. Кола сюжэтаў у народнай скульптуры было амаль заўсёды акрэслена сакральнай тэматыкай. Дзеля большай выразнасці і лепшага зберажэння свае скульптуры народныя майстры паліхромна размалёўвалі як мага бліжэй да натуральнага. Няма данных аб тым калі ў Віцебску ўзніклі цэхавыя аб’яднянні. Вядома толькі, што ў 1760 г. быў створаны цэх рэзчыкаў, карэтнікаў, плотнікаў, бондараў і сталяроў, усяго ў Віцебску ў канцы XVIII ст. існавала 9 розных цэхаў.

У канцы XIX – пачатку XX ст. цэхавыя рамеснікі і вясковыя майстры выконвалі разьбу як па аздабленні храмаў, палацаў, так і жылых дамоў. Калі ў сялянскім і гарадскім народным жыллі была распаўсюджана праразная разьба (выпілоўка), то заможныя жыхары, пераважна ў гарадах, аздаблялі свае пабудовы і ральефнай разьбой.

Асноўнымі матывамі разьбы былі выявы сонца, раслін, жывёл, птах, якія мелі татэмныя, ці аберагальныя значэнні. Народная мэбля аздаблялася пераважна праразной, гранёна-выемчатай, альбо нізкарэльефнай разьбой.

Сярод драўляных утылітарных і утылітарна-дэкаратыўных вырабаў на Віцебшчыне атрымалі распаўсюджанне прасніцы, качалкі (для бялізны), пернiковыя дошкі, посуд, набоечныя дошкі, такарныя і бандарныя вырабы хатняга карыстання. Некаторыя з іх дэманстраваліся на Мінскай сельскагаспадарчай і кустарнай выставе ў 1901 годзе, на выставе народнай творчасці ў Вільні ў 1913 годзе.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года ўвага новага ўрада была накіравана на падтрымку народнага мастацтва, гэта ўрадавыя пастановы 1919 і 1921 г.г., беларуская выстава ў Мінску ў 1925 г. і Усесаюзная ў 1940 г.

У 1939 годзе ў Віцебску створаны Дом народнай творчасці, які садзейнічаў падтрымцы народных самадзейных майстроў і мастакоў. Але трэба адзначыць, што развіццё разбярскага мастацтва ў аздабленні храмаў пасля 1917 года прыпынілася да 80-х гадоў XX ст. Майстры, працаваўшыя раней над сакральнымі разьбянымі вырабамі, павінны былі перакваліфікавацца, альбо заняцца іншымі відамі дрэваапрацоўкі, што адмоўна адбілася на развіцці разьбарства (апроч заходніх раёнаў Беларусі).

У пасляваенныя гады (XX ст.) прымаюцца меры па адраджэнню разьбы. Работы беларускіх майстроў-разьбяроў былі прадстаўлены на выставе ў Маскве (1955 г.). Майстры гэтага часу імкнуліся рабіць станкавыя кампазіцыі, арыентава-



Репозиторий ВГУ

ныя на прафесійнае мастацтва. Трэба адзначыць, што (40-50-я) гады з'явіліся часам пошуку і адражэння мастацтва разьбы на Віцебшчыне, але тэматыка была яшчэ палітызаваная. І толькі ў 60-я гады майстры змаглі выконваць разьбяныя работы на розную тэматыку.

У творчы працэс адраджэння разьбы па дрэве 60-80 гадоў уключылася значная частка майстроў, якія раней былі зусім незнаёмыя гледачу. Па іх словах, яны працавалі для душы, выказваючы ў сваіх творах свой светапогляд на акаляючую рэчаіснасць.

Яны паступова адыходзяць ад статычных, “нежывых” вобразаў і пачынаюць выходзіць у сваіх творах на жывога чалавека, якому характэрны і сум, і героіка, і гумар, гэтаму садзейнічалі і метыдысты Віцебскага Дома народнай творчасці.

Новыя адносіны да разной пластыкі ахопліваюць творчасць большасці майстроў, умоўна можна сказаць, што пачаўся працэс «рэнесансу» у разьбе. У гэты перыяд для гледачаў адкрываюцца новыя творцы разца.

На Віцебшчыне працавалі і працуюць разьбяры розных накірункаў, з рознай мастацкай падрыхтоўкай, розным светаўспрыманнем.

Да першага накірунку трэба аднесці майстроў наіўна-прымітыўнага разьбярства, якія не маюць ніякай мастацкай падрыхтоўкі і па сваёй спецыяльнасці далёкія ад мастацтва. Яны не выкарыстоўваюць ніякіх мастацкіх прыкладаў, іх творчасцю кіруюць ўнутранае пачуццё і патрэба тварыць для душы, сваіх родных і блізкіх. Глядач спачатку з усмешкай, а потым у задуменні аналізуе гэтыя творы – значыць яны яго закранулі.

Да другога накірунку творчасці разьбяроў трэба аднесці майстроў-самавукаў, якія самастойна авалодалі гэтым відам творчасці пры дапамозе спецыяльнай літаратуры, інтэрнету, на прыкладах іншых майстроў, навучаліся ў гуртках ці ў знаёмага майстра. Гэта людзі, якія імкнуцца самастойна авалодаць сакрэтамі творчасці.

Да трэцяга накірунку адносяцца майстры, якія атрымалі прафесійную адукацыю па мастацкай апрацоўцы дрэва, валодаюць малюнкам і законамі кампазіцыі. Значную ролю ў падрыхтоўцы такіх майстроў-мастакоў на Віцебшчыне адыграў мастацка-графічны факультэт ВПІ імя С.М.Кірава, а потым ВДУ імя П.М.Машэрава, дзе была створана кафедра дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (1965 г.), на якой і сёння студэнты-юнакі асвойваць асновы розных відаў разьбы.

Другі значны штуршок у падрыхтоўцы майстроў разьбяных спраў зрабіла Віцебскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча №163, адкрытае ў 1983 годзе, (зараз - дзяржаўны прафесійны тэхналагічны каледж), дзе рыхтуюць майстроў-мастакаоў дэкаратыўна прыкладнога мастацтва (сярадняга звяна), у тым ліку і па разьбе.

Творчасць мясцовых народных майстроў канец ХХ пачатак ХХІ ст. характэрызуецца інтэнсіўным развіццём пластыкі малых форм, асабліва ў бытавым жанры з гумарыстычным ухілам. Кожны майстар імкнецца адшукаць сваю манеру ўвасаблення вобраза, свой стыль разьбы. У пачатку ХХІ ст. на Віцебшчыне працуе болей 100 майстраў, з якіх 50 заўседы прымаюць ўдзел у розных мерыпрыемствах і выставах.

ЛІТАРАТУРА

1. Абсцедарский Л.С. Белорусы в Москве.XVII в. Мн.. 1957.
2. Бессонаў С.В. Беларускія мастацкія майстры ў Маскве XVII ст. Весці АН Беларускай ССР. Аддзяленне грамадскіх навук. Серыя гістарычная.Вып.1.1947.
3. Высоцкая Н.Ф. Пластыка Беларусі XII – XVIII ст.ст. Мн., 1983.
4. Сахута Я.М. Народная разьба па дрэве. Мн.. 1978.
5. Игнатенко А.П. Ремесленное производство в городах Белоруссии в XVII – XVIII вв. Изд. Минист.высш.,сред.спец и профессионального образования БССР. Мн., 1963.
6. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. Мн., 1984-1987.



Репозиторий ВГУ